*С.В.Шалашэнь*

# ЭПІКГРАМЫ ДА СЛУЖБОВЫХ КНІГ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XVI–XVII стст.

Эпіграма як своеасаблівы лірычны жанр мае працяглую гісторыю, якая пачынаецца з антычнасці. У старажытнай грэчаскай паэзіі эпіграмай называўся кароткі лірычны верш адвольнага зместу (спачатку – прысвячальныя надпісы, потым – эпітафіі, павучанні, апісанні, любоўныя, застольныя, сатырычныя вершы, напісаныя элегічным дывершам). З’яўленне першых эпіграм у грэчаскай літаратуры датуецца VII–VI стст. да н. э., а іх росквіт як жанру прыпадае на III ст. да н. э. – I ст. н. э.

У старабеларускай літаратуры гэты жанр значна трансфармаваўся і набыў рысы эмблематычнай паэзіі, што робіць мэтазгодным ужыванне тэрміна “эпікграма”: дзеля адрозніваня ад эпіграм у сучасным разуменні гэтага жанру – кароткіх сатырычных вершаў. Старабеларускія эпікграмы растлумачвалі знакавую сістэму гербаў славутых шляхецкіх родаў, раскрывалі іх сімвалічную сувязь са справамі прадстаўнікоў згаданых родаў. Такія вершы з’яўляліся важнай састаўной часткай прадмоўна-пасляслоўнага комплексу да друкаваных кніг XVI–XVII стст., дзе былі непарыўна звязаны з адзіным нелітаратурным кампанентам – гербам-гравюрай. Звычайна ў кнігах змяшчаўся герб апекуна друкара, а эпікграма дазваляла паэту ўславіць справы, розум, паходжанне мецэната, выказаць сваё захапленне веліччу яго роду. Назва верша адразу раскрывала яго сутнасць і прызначэнне: “На герб его милости пана Симеона Войны”, “Епикграмма на герб” і інш.

Адной з галоўных асаблівасцей старабеларускай літаратуры можна назваць літаратурны этыкет, які прадугледжвае выяўленне некаторых з’яў у традыцыйных, устойлівых, кананічных формах. Гэта адносіцца і да жанру эпікграм, якія мелі замацаваную кампазіцыю: “Яны складаліся з чатырох элементаў, якія размяшчаліся, як правіла, у строгай паслядоўнасці адносна адзін аднаго. Спачатку ішоў уступ-зачын, затым – зварот да памяці продкаў, цэнтральнае месца займалі тлумачэнні знакаў (“кляйнотаў”) герба і, нарэшце, завяршала эпікграму дакончанне-пажаданне” [3, с. 47].

Эпікграмы мелі традыцыйную кампазіцыю. Аднак аўтары такіх вершаў лічылі неабходным падкрэсліць вялікую набожнасць свайго

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

апекуна, апець яго літасцівасць, богаўгодныя і дабрачынныя справы.

Напрыклад, Лявон Мамоніч пачынае эпіграму “На герб зацного дому его милости пана Лукаша Ивановича Мамонича... з разважанняў аб высакароднасці і патрэбе як мага часцей расказваць аб справах высакародных людзей”. Такім чынам ён падводзіць чытача да разумення мэты паэта – уславіць род Лукаша Мамоніча” [2, с. 37]:

Никое ино добро не величить тако
Мужа, благородству подобяща ся всяко.
Срам убо малити ся, в них же побЂждати,
СрамнЂ ж побЂждати, в них же ся малити.
Ниже в похвалении ест ино любезнЂе,
Якоже, егда имать что рещи полезнЂе.
Не преподобно убо о благих молчати,
Яко же и не тая ж де воспоминати.

“Епикграмма на герб...”, змешчаная ў выданні “Книга Новога ЗавЂта” (Еўе, 1611), у якасці зачына тлумачыць сімвал крыжа. Задума паэта становіцца зразумелай, калі высняецца, што крыж з’яўляецца часткай герба Багдана Агінскага.

Важная частка эпіграм – зварот да памяці продкаў славутага роду, таму што толькі дзякуючы іх славутым здзяйсненням узнік гэты герб. “Епикграмма на герб...” (Еўе, 1611) услаўляе набожнасць і трывалую веру, якой здаўна ганарыўся род Агінскіх. Безумоўна, у вершы не магла быць не адзначана такая рыса [2, с. 64]:

Щасливый дом Окгинских, который тот мает
Клейнот, с продков поданый, и в ним ся кохает.
Кгдыж то знак набоженства и сталое вЂры,
Тым ся здавна их здобят сынове и дщеры.

“Евангеліе учителное” (Еўе, 1616) змяшчае эпіграму “На старожитный клейнот их милостей княжат Соломирицких”, якая ўсхваляе славутыя справы і моцную веру гэтага роду [2, с. 64]:

Славу в том старожитном и презацном дому
Квитнучую и давных от вЂков никому
Не тайную, клейноты в гербах выражают,
А цноту, дЂлность, вЂру сполне высвЂдчают.

Трэцім структурным кампанентам эпіграмы з’яўляецца тлумачэнне сімвалічнага сэнсу гербаў. Гэтая частка найбольш насычаная метафарамі і сімваламі, таму што паэты намагаліся

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

знайсці сувязь паміж геральдычнымі знакамі і славутай дзейнасцю шляхецкага роду. Лявон Мамоніч у эпіграме на герб Лукаша Мамоніча разглядае сімвалы стралы і крыжа [2, с. 37]:

Стрѣла убо воздух прерѣзуе высоко,
Туголучно испущена летит широко.
Крест же паче сея небеси ся касает,
Сего носяй, свѣтлѣе паче всѣх бывает.

Зброя заўсёды была прыналежнасцю шляхты, што і абумовіла ўжыванне сімволікі стралы. Крыж як сімвал вельмі часта сустракаецца ў эпіграмах дадзенай эпохі, асабліва ж гэта адносіцца да службовых кніг. Менавіта крыж бліжэй за ўсё астатняе знаходзіцца да нябёсаў, і чалавек, які мае гонар валодаць такім гербам, таксама набліжаны да іх і надзелены іх святлом.

У эпіграме “На герб его милости пана Симеона Войны” Казьма Мамоніч разглядае сімвалы зоркі “пентекарас” і лілеі. На яго погляд, менавіта гэтая зорка свеціць ярчэй за ўсе іншыя (“Ясна бывает над иншые звезды, – ясност болшую в собѣ мает”), а лілея, кветка прыгожая і бялюткая, ясна паказвае, што гэты дом дабрародны і багаты.

У выданні Новага Запавету 1623 г. змешчана эпіграма “На герб их милости панов Сапегов”. Тут паказаны традыцыйныя сімвалы крыжа і стралы, якія для паэта з’яўляюцца моцнай зброяй: першы – для ворагаў духоўных, другі – для ворагаў радзімы [2, с. 85]:

Двѣма кресты з стрѣлою дом Сапегов славных
Бог, свет, мужство, очизна з вѣков стародавных
Возвысшыли. Крестами врага души громят,
Противников отчизны стрѣлою одгонят.

Апошняй часткай эпіграм з’яўлялася дакончанне-пажаданне, у якім аўтары жадалі шляхціцам доўгіх гадоў слаўнага жыцця, непахіснай веры, стойкасці [2, с. 75]:

Жіи во всѣ лѣта, по смерти што ест дознаеш,
Же милуеш бога и вѣру помнажаеш.

Такім чынам, эпіграмы да службовых кніг з’яўляліся яркім прыкладам гэтага жанру. Паэты звычайна традыцыйна падыходзілі да эпічнага вершаскладання. Аднак у межах паэтыкі ў эпіграмах былі арыгінальныя і запамінальныя мастацкія вобразы, якія значна ўзбагачалі беларускую кніжную паэзію.

БІБЛІЯТЭКА БДПУ

*1. Литературный* энциклопедический словарь. – М., 1987.
*2. Прадмовы* і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны // Укл., уст. артыкул і каментарыі У.Г.Кароткага. – Мн., 1991.
*3. Саверчанка І.В.* Старажытная паэзія Беларусі. XVI – першая палова XVII ст. – Мн., 1992.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ